Узорны фальклорны калектыў "Карагод" Ліплянскага сельскага дома культуры

Гісторыя дзіцячага фальклорнага калектыву "Карагод" пачалася ў 2000 годзе з стварэння на базе сельскага дома культуры гуртка народных бытавых танцаў. У пачатку гэта быў невялікі танцавальны гурток, затым мастацкі калектыў, у склад якога ўваходзіла 12 хлопчыкаў і дзяўчынак ва ўзросце 7 гадоў. У 2005 годзе калектыву прысвоена ганаровае найменне "узорны". "Карагод" з'яўляецца спадарожнікам народнага фальклорнага ансамбля "Вяснянка". Разам з імі прымаюць удзел у розных канцэртах, народных святах і абрадах.

Падчас выступу ўдзельнікі здзіўляюць натуральнасцю паводзін на сцэне, здольнасцю да імправізацыі і адначасова выхаванасцю, стрыманасцю, той унутранай культурай, якая фарміруецца не ў шуме апладысментаў, а ў крапатлівай працы па засваенні мясцовых традыцый народнага мастацтва. Гэта таленавітыя дзеці, якія развіваюць свае мастацкія здольнасці ў розных напрамках-песнях, танцах, гульнях.

Асаблівасцю калектыву з'яўляецца і тое, што "артысты" апранаюцца у святочныя ўборы, вырабленыя і ўпрыгожаныя, з улікам мясцовых традыцый. Кожны год калектыў папаўняецца новымі ўдзельнікамі, зараз у ім займаецца 18 дзяцей: 9 хлопчыкаў і 9 дзяўчынак.

У рэпертуары "Карагода" - абрадавыя (вясновыя, купальскія, жніўныя) і пазаабрадавыя песні, мясцовыя танцы і карагоды.

Разам з дарослымі калектыў прымае ўдзел у вясковых святах і абрадах "Купалле", "Свята першай баразны","Зажынкі".

Выступленне дзіцячага калектыву заўсёды выклікае захапленне і цікавасць гледачоў. Узорны фальклорны калектыў вядомы не толькі ў сваім раёне, але і за яго межамі.

Народны фальклорны ансамбль"Вяснянка" Ліплянскага сельскага дома культуры

Народны фальклорны ансамбль Ліплянскага дома культуры, пачаў сваю творчую дзейнасць у 1965 годзе. Арганізатарам і кіраўніком калектыву з дня заснавання была Сечка Наталля Іванаўна, з 2010 года калектыў узначаліла яе дачка Лось Людміла Міхайлаўна - дырэктар Ліплянскага сельскага дома культуры. У склад калектыву ўваходзіць 14 чалавек.

У 2002 годзе за высокае выканальніцкае майстэрства, творчае развіццё нацыянальных культурных традыцый і актыўную канцэртную дзейнасць фальклорнаму ансамблю "Вяснянка" прысвоена Найменнем "Народны самадзейны калектыў".

Гэты калектыў - жаданы госць не толькі на мерапрыемствах у Ліплянскім сельскім доме культуры, у раёне, але і за яго межамі.

"Вяснянка" неаднаразова запрашалася на святочныя канцэрты ў гарады Гомель, Мінск, Мазыр, суседняй Украіны.

Калектыў неаднаразова здымаўся на тэлебачанні, у кіначасопісы: "Песні Палесся", "Беларусь мая сінявокая", а таксама ў 1970 годзе прыняў удзел у здымках мастацкага фільма "Спяшайцеся будаваць дом". Рэпертуар "Вяснянкі" складаецца з беларускіх народных песень і народных бытавых танцаў, запісаных ад носьбітаў фальклору д. Ліпляны.

Народны драматычны калектыў "Натхненне" Дуброўскага сельскага дома культуры

Драматычны калектыў "Натхненне" быў створаны ў студзені 2003 года, на базе Дуброўскага сельскага дома культуры.

У склад калектыву ўваходзяць 14 чалавек: 8 юнакоў і 6 дзяўчат. Узрост удзельнікаў ад 16 да 25 гадоў.

Асноўная мэта калектыву-прапаганда тэатральнага мастацтва, арганізацыя вольнага часу моладзі, эстэтычнае выхаванне і развіццё творчай здольнасці ўдзельнікаў.

Асновай для заняткаў у калектыве з'яўляецца навучанне тэатральнаму мастацтву па наступных прадметах: акцёрскае майстэрства, сцэнічная мова, сцэнічны рух і інш.

У творчай скарбонцы драматычнага гуртка: спектаклі, агітбрыгадныя выступы, інтэрмедыі, вершы, маналогі, літаратурна-драматычныя кампазіцыі.

Што тычыцца рэпертуару, то ўдзельнікі калектыву аддаюць перавагу каларытнай беларускай п'есе, аднак у рэпертуары маюць месца быць творы і расійскіх аўтараў: ТЭФІ, А. Аверчанка, В. Шукшына і інш.

Першай творчай працай тэатралаў-аматараў быў урывак са спектакля А. Макаёнка "Трыбунал", ён жа і быў прадстаўлены на раённы агляд-конкурс тэатральнага мастацтва, дзе атрымаў дыплом I ступені. Яшчэ адной яркай працай "Натхнення" стаў мініспектакль па п'есе К.Каганца «Модны шляхцюк».

У 2006 годзе калектыву "Натхненне" было прысвоена найменне "Народны".

Заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь "Журавінка" Слабадскога сельскага дома культуры

Вёска Слабада-невычэрпная крыніца народнай творчасці, адметнага выканальніцкага стылю, унікальнага песеннага і танцавальнага фальклору. Каб падтрымаць гэты багаты пласт духоўнай народнай культуры ў 1987 годзе быў створаны фальклорны калектыў" Журавінка". У склад калектыву ўваходзіла 24 чалавекі. Арганізатарам і кіраўніком была дырэктар Слабадскога сельскага дома культуры, Ганна Васільеўна Сакалоўская.

Усе выступленні калектыву складаюцца з беларускіх народных песень і народна-бытавых танцаў мясцовага паходжання.

Рэпертуар калектыву вельмі рознабаковы - тут і сямейнаабрадавыя, каляндарна-земляробчыя, пазаабрадавыя песні. З вялікім задавальненнем самадзейныя артысты выконваюць і гумарыстычныя народныя песні і прыпеўкі, танчаць забытыя танцы сваіх продкаў: "Цёмна ночка", "Месяц", "Матлёт", "Субота" і інш. Адметнай асаблівасцю калектыву з'яўляецца і адзенне удзельнікаў: святочныя, яркія, старадаўнія касцюмы, пашытыя рукамі саміх удзельнікаў, з улікам мастацкіх традыцый сваёй мясцовасці.

У 1990 годзе калектыў прымаў удзел у здымках праграммы "Запрашаем на вячоркі" з элементамі вясельнага абраду, а ў 1995 годзе, у той жа праграме - з абрадам "Шчодрыкі".

У снежні 1992 года калектыву было прысвоена найменне "Народны аматарскі калектыў", а праз 10 гадоў, у ліпені 2002 года, рашэннем калегіі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь было прысвоена ганаровае званне "Заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь".

У цяперашні час у склад «Журавінкі» ўваходзіць 14 жанчын, кожную з якіх можна назваць носьбітам мясцовага фальклору і народных традыцый.

За перыяд свайго існавання калектыў прымаў удзел ва ўсіх раённых святах народнай творчасці, а таксама святах, прысвечаных знамянальным і юбілейным датам. "Журавінка" прадстаўляла народнае мастацтва Лельчыцкага раёна і Гомельшчыны на міжнародных, рэспубліканскіх і абласных святах і фестывалях.

За актыўную прапаганду народнай творчасці калектыў неаднаразова ўзнагароджваўся граматамі і дыпломамі рэспубліканскага, абласнога і раённага ўзроўню.

Народны фальклорны калектыў "Палескія напевы" Нова-Палескага сельскага клуба Лельчыцкага раёна

З пакон вякоў наш раён славіцца сваімі талентамі, а вёска Новае Палессе-гэта песенны куток, дзе да цяперашняга часу захаваліся старадаўнія, народныя абрады, святы, песні і танцы. Таму, не выпадкова, у 2000 годзе тут быў створаны фальклорны калектыў "Палескія напевы", а ў 2005г. прысвоена найменне "народны". У слад фальклорнага калектыву ўваходзяць 11 жанчын сярэдняга і пажылога ўзросту. Кожная з гэтых жанчын ўносіць свой каларыт, сваё прадстаўленне песні.

Галоўная мэта калектыву - збор, захаванне, адраджэнне і папулярызацыя традыцыйнай культуры сваёй вёскі. Усе песні яны выконваюць у непаўторнай, уласцівай толькі гэтым жанчынам манеры, што асабліва захапляе. Сваім выканаўчым майстэрствам жанчыны хвалююць і раскрываюць душу, глыбокія перажыванні, думкі і мары вяскоўцаў.

Арганізатар фальклорнага калектыву - Марыя Уладзіміраўна Светава, якая з'яўляецца загадчыкам Нова-Палескага сельскага клуба, мастацкі кіраўнік - Палын Ніна Аляксееўна.

На працягу ўсяго часу, разам з песнямі ўдзельнікі калектыву пачалі адраджаць і абрады, у працэсе правядзення іх, песні загучалі па-новаму, іх змест стаў зразумелым кожнаму глядачу.

Касцюмы калектыву выраблены рукамі саміх удзельніц, з улікам народных традыцый і адпавядаюць мясцоваму строю.

У студзені 2005 года народны фальклорны калектыў "Палескія напевы " прыняў удзел у Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі, якая адбылася пад эгідай ЮНЕСКА. У сакавіку таго ж года "Палескім напевам" было прысвоена званне " Народны фальклорны калектыў"»

У маі 2009 года, блоку старадаўніх песень у выкананні народнага фальклорнага калектыву "Палескія напевы", быў прысвоены статус гісторыка-культурнай каштоўнасці Рэспублікі Беларусь.

Народны хор"Славяне"
Глушкавіцкага культурна-спартыўнага цэнтра

Глушкавіцкі хор быў створаны ў 1936 годзе. Першымі яго удзельнікамі былі пагранічнікі з пагранзаставы і мясцовыя актывісты. Рэпертуар хору складаўся з беларускіх, рускіх і украінскіх песен.

Глушкавіцкі хор са сваёй народнай манерай выканання заўсёды захапляў на сваіх канцэртах жыхароў гарадоў Мазыр, Гомель, Мінск.

У 1968 годзе хор быў запрошаны ў Мінск на музычна-этнаграфічныя канцэрты палескай народнай песні, дзе было адзначана грамадскасцю сталіцы, высокае майстэрства нашых выканаўцаў. Хор выступаў у канцэртнай зале Белдзяржкансерваторыі, Саюза пісьменнікаў, доме работнікаў творчасці, на радыё і тэлебачанні.

Хор прымаў таксама ўдзел у тэлеперадачы для Усесаюзнага фальклорнага клуба "Крыніцы".

У 1970 годзе кіраўніком Глушкавіцкага хору стаў Драчэўскі Сяргей Нікадзімавіч - выпускнік Львоўскай кансерваторыі. Па яго ініцыятыве на базе Глушкавіцкага хору была створана аб'яднаная харавая капэла Беларусі і Украіны, якая атрымала назву «Славянін».

У склад аб'яднанага хору ўваходзілі самадзейныя калектывы вёскі Глушкавічы Лельчыцкага раёна, вёсак Копішча і Майдан Капішчанскі Олеўскага раёна (Украіна).

За актыўны ўдзел у развіцці мастацкай самадзейнасці і высокае выканальніцкае майстэрства ў 1973 годзе хор атрымаў Найменне "Народны".

Народны хор Глушкавіцкага КСЦ прымае ўдзел у раённых, абласных і рэспубліканскіх святах, аглядах, фестывалях.

Народны хор работнікаў культуры "Зараніца"
ДУ "Лельчыцкі раённы цэнтр культуры

і народнай творчасці»

Народны хор работнікаў культуры "Зараніца" быў створаны ў 2002 годзе, званне «Народны» прысвоены ў 2006г. і з'яўляецца адным з вядучых творчых калектываў Лельчыцкага раёна. Ніводнага мерапрыемства не абыходзіцца без удзелу народнага хору.

У склад хору ўваходзіць 32 чалавекі: 22 жанчыны і 10 мужчын. Аснова рэпертуару хору-беларускія, рускія, украінскія народныя песні ў апрацоўках. Выхаваўчая роля харавога спеву велізарны. Жыццярадасныя, патрыятычныя, лірычныя песні, якія гучаць у выкананні хору, аб'ядноўваюць пачуцці і настрой рознаўзроставай катэгорыі насельніцтва. Акампануе хору ансамбль народных інструментаў.

Хор "Зараніца" - актыўны ўдзельнік раённых, абласных і рэспубліканскіх аглядаў-конкурсаў, фестываляў і святаў.

Народны фальклорны калектыў "Танежанка"
Танежскага сельскага дома культуры Лельчыцкага раёна

Калектыў "Танежанка" быў створаны ў 1934 годзе пры Танежскім сельскім клубе. У пачатку гэта быў калектыў народнай песні, які папаўняўся і набіраў творчы рост. У 1984 годзе, гэта быў ужо хор, у склад якога ўваходзіла 40 чалавек, у гэтым жа годзе, хору было прысвоена ганаровае званне "Народны". У 2006 годзе, у сувязі з дэмаграфічнай народны хор быў рэарганізаваны ў народны фальклорны калектыў "Танежанка", у склад якога зараз уваходзіць 12 чалавек. Галоўная мэта калектыву-захаванне і папулярызацыя гісторыка-культурных каштоўнасцей сваёй вёскі. Зацікаўленасць і захаванне песеннага і вусна-паэтычнага мастацтва з'яўляецца для ўдзельнікаў калектыву сэнсам іх жыцця, часткай іх маладосці.

У рэпертуар "Танежанкі " ўваходзяць беларускія народныя песні, абрадавыя і пазаабрадавыя, вясельныя песні, вяснянкі, карагодныя песні, запісаныя са слоў носьбітаў фальклору в.Тонеж.

Зараз у рэпертуары "Танежанкі" больш за 75-ці розна-жанравых твор.

Найбольш цікавым і паказальным з'яўляецца абрад "Чырачка", які праводзіцца за сем тыдняў да Вялікдня.

У 2012 годзе калектыў прымаў удзел у здымках дакументальнага фільма "Пад белым крылом Лелькі" ў рамках Рэспубліканскага праекта "Зямля Беларуская".

Народны фальклорны калектыў "Танежанка", як яркі носьбіт мясцовых традыцый, неаднаразова ўзнагароджваўся дыпломамі і ганаровымі граматамі рознага ўзроўню. У снежні 2022 года за значныя дасягненні ў захаванні музычнай спадчыны, звычаяў і традыцый Палескага рэгіёна народны фальклорны калектыў "Таняжанка" філіяла "Танежскі сельскі дом культуры" удастоены спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А.Р. Лукашэнка.

Народны ансамбль народнай песні " Лагода»
ДУ " Лельчыцкі раённы цэнтр культуры
і народнай творчасці»

Народны ансамбль народнай песні "Лагода" быў створаны ў лютым 2005 года на базе Лельчыцкага аўтаклуба з мэтай прапаганды песеннага мастацтва, эстэтычнага выхавання і развіцця творчых здольнасцяў удзельнікаў, арганізацыі вольнага часу насельніцтва.

У 2009 годзе калектыву было прысвоена ганаровае найменне "Народны самадзейны калектыў".

Кіраўніком ансамбля "Лагода" з першага дня стварэння з'яўляецца хормайстар народнага хору работнікаў культуры "Зараніца" Ляўкоўскі Уладзімір Мікалаевіч.

У склад Народнага ансамбля "Лагода" ўваходзяць 12 чалавек (5 мужчын і 7 жанчын). Гэта маладыя, прыгожыя, таленавітыя, закаханыя у свой край і беларускую народную песню людзі, з вялікім творчым патэнцыялам.

Аснову рэпертуару складаюць апрацоўкі беларускіх народных песень, творы беларускіх і рускіх кампазітараў для калектываў з народнай манерай выканання.

Кожны канцэртны нумар, які выконвае "Лагода" мае добры выканальніцкі ўзровень, да таго ж выканаўцы ансамбля імкнуцца ўнесці ў песню каларыт, якім багата традыцыйны спеў палескага краю.

Калектыў вядзе актыўную канцэртную дзейнасць. З вялікім поспехам ансамбль выступаў на розных канцэртных пляцоўках гарадоў Беларусі.

Народны мужчынскі вакальны ансамбль «Лель»
ДУ " Лельчыцкі раённы цэнтр культуры
і народнай творчасці»

Народны мужчынскі вакальны ансамбль "Лель " створаны 2000г., найменне "Народны" прысвоена ў 2006г. у складзе калектыву 5 удзельнікаў.

Аснову рэпертуару складаюць апрацоўкі беларускіх народных песень, творы беларускіх і рускіх кампазітараў для калектываў з народнай манерай выканання.

За перыяд свайго існавання калектыў прымаў удзел ва усіх раённых святах народнай творчасці, а таксама святах, прысвечаных знамянальным і юбілейным датам. "Лель" прадстаўляў народнае мастацтва Лельчыцкага раёна і Гомельшчыны на міжнародных, рэспубліканскіх і абласных святах, фестывалях. Калектыў вядзе актыўную канцэртную дзейнасць. З вялікім поспехам ансамбль выступаў на розных канцэртных пляцоўках гарадоў Беларусі.

За актыўную прапаганду народнай творчасці калектыў неаднаразова ўзнагароджваўся граматамі і дыпломамі, абласнога і раённага ўзроўню.

Народны вакальны ансамбль "Вербніца"
ДУ "Лельчыцкі раённы цэнтр культуры
і народнай творчасці"

Народны вакальны ансамбль "Вербніца" створаны ў 1990г. найменш "Народны" прысвоена ў 1996г. у складзе калектыву 7 удзельнік.

За перыяд свайго існавання калектыў прымаў удзел у усіх раённых святах народнай творчасці, а таксама святах, прысвечаных знамянальным і юбілейным датам. "Вербніца» прадстаўляла народнае мастацтва Лельчыцкага раёна і Гомельшчыны на рэспубліканскіх і абласных святах, фестывалях.

Аснову рэпертуару складаюць апрацоўкі беларускіх народных песень, творы беларускіх і рускіх кампазітараў для калектываў з народнай манерай выканання.

Калектыў вядзе актыўную канцэртную дзейнасць. З вялікім поспехам ансамбль выступаў на розных канцэртных пляцоўках гарадоў Беларусі.

За актыўную прапаганду народнай творчасці калектыў неаднаразова ўзнагароджваўся граматамі і дыпломамі, абласнога і раённага ўзроўню.

харэаграфічны калектыў " Фантазёры»
ДУА «Дзіцячая школа мастацтваў г. п. Лельчыцы
імя М. П. Дрынеўскага»

Дзіцячы харэаграфічны калектыў "Фантазёры" ДУА "Дзіцячая школа мастацтваў г. п. Лельчыцы імя М. П. Дрынеўскага" быў утвораны ў 1992 г. Мэта калектыву - развіццё творчых здольнасцяў дзяцей, папулярызацыя народнага танца беларускай традыцыйнай харэаграфіі. Кіраўніком ансамбля на працягу многіх гадоў З'яўляецца Тарасовец Алена Уладзіміраўна. У 1995 годзе ансамблю танца было прысвоена ганаровае званне "Узорны аматарскі калектыў".

Харэаграфічны калектыў "Фантазёры" налічвае больш за 65 навучэнцаў ва ўзросце 9-15 гадоў. Для якаснага адбору дзяцей у ансамбль пры аддзяленні харэаграфіі працуе падрыхтоўчая група. За час свайго існавання ўзорны ансамбль "Фантазёры" быў удзельнікам многіх святаў, фестываляў, конкурсаў. Так у 2022 годзе ансамбль стаў дыпламантам абласнога свята харэаграфічнага мастацтва імя Рыбальчанкі А.А., узнагароджаны дыпломам лаўрэата II ступені міжнароднага шматжанравага конкурсу-фестывалю "Унісон Сэрца". Танцавальны рэпертуар калектыву складаецца з беларускіх, рускіх, а таксама эстрадных і бальных танцаў.

Дзіцячы ўзорны ансамбль танца "Фантазёры" прымае актыўны ўдзел у творчым і культурным жыцці раёна. З велізарным задавальненнем ён заўсёды прадстаўляе свае новыя і даўно ўпадабаныя гледачам канцэртныя нумары.

На працягу ўсяго тэрміну свайго існавання ансамбль танца выгадаваў шмат таленавітых дзяцей. Многія з выпускнікоў паступілі і

паспяхова скончылі сярэднія спецыяльныя і вышэйшыя навучальныя ўстановы па спецыяльнасці харэаграфія, маюць свае калектывы. Дзіцячы ўзорны ансамбль танца з годнасцю нясе сваё ганаровае званне, ганарыцца ім і з'яўляецца прыкладам і ўзорам для самадзейных калектываў горада і раёна.